ПАДЗЕЯ




# ВОРАНАЎСКІЯ ЧЫТАННІ-2025: ШЛЯХАМ ВЕЧНЫХ ІСЦІН

**ВОРАНАВА. 5-га лістапада 2025 года раённы цэнтр на паўночным захадзе Гродзенскай вобласці прымаў удзельнікаў II літаратурна-краязнаўчага форуму «Воранаўскія чытанні».**

Арганізатары форуму – Воранаўскі райвыканкам (старшыня Васіль Мікалаевіч Шлык); Воранаўскі раённы Савет дэпутатаў (старшыня Алена Янаўна Ганевіч). Літаратурна-краязнаўчыя чытанні ў Воранаве стартавалі ў 2023 годзе. Іх ідэя ўзнікла ў працэсе рэалізацыі дамовы аб супрацоўніцтве паміж Гродзенскім дзяржаўным універсітэтам імя Янкі Купалы і Воранаўскім райвыканкамам. У раёне надаецца вельмі вялікая ўвага гуманітарным ведам, мастацкаму слову. Тут ужо шмат гадоў праходзяць фальклорную практыку гродзенскія студэнты-філолагі. Тут добра разумеюць – веданне сваёй малой радзімы, уменне выказаць свае пачуцці да яе адкрываюць шырокія магчымасці для гарманічнага развіцця, патрыятычнага светапогляду і ўмацавання грамадзянскіх асноў соцыума. Фінансавую падтрымку форуму аказалі сельгаспрадпрыемствы э/б “Кастрычнік” і “Эліт-Агра Больцінікі” (кіраўнікі Андрэй Венцкевіч і Сяргей Мікутайціс). Сёлета мерапрыемства прысвечана 80-годдзю Вялікай Перамогі і 85-годдзю ўтварэння Воранаўскага раёна.



“Воранаўскія чытанні-2025” сабралі ў актавай зале Раённага цэнтра культуры краязнаўцаў, педагогаў, літаратараў і ўсіх жыхароў раёна, хто цікавіцца гісторыяй малой радзімы. Сярод удзельнікаў форуму: старшыня асацыяцыі Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў Алена Антонава; дырэктар РУП “Выдавецтва “Беларусь”, краязнавец, журналіст, старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Аляксандр Карлюкевіч; намеснік дырэктара Гродзенскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці Наталля Рамановіч; намеснік старшыні Воранаўскага райвыканкама Андрэй Карповіч; намеснік старшыні Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Дзмітрый Радзівончык; госці з Расіі – намеснік кіраўніка і эксперт прадстаўніцтва Ніжагародскай вобласці Расійскай Федэрацыі ў Рэспубліцы Беларусь Святлана Мазанік і Андрэй Струнеўскі, а таксама выкладчыкі Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы: кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі Аліна Сабуць; кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі, член СПБ Руслан Казлоўскі; кадыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай філалогіі Станіслаў Янушкевіч; кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры турызму і культурнай спадчыны Віталь Карнялюк; кандыдат гістарычных навук, загадчык кафедры гісторыі Беларусі, археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Сяргей Амелька; кандыдат гістарычных навук, намеснік дэкана факультэта гісторыі, камунікацыі і турызму Андрэй Гецэвіч. Удзельнікаў II літаратурна-краязнаўчага форуму “Воранаўскія чытанні” прывітала старшыня Воранаўскага раённага Савета дэпутатаў Алена Ганевіч.




Пленарнае пасяджэнне, якое адкрылася выступленнем старшыні Саюза пісьменнікаў Беларусі Аляксандра Карлюкевіча, склалі краязнаўчыя, навуковыя даклады, прысвечаныя гісторыі і культуры Воранаўскага краю, постацям яго славутых і таленавітых ураджэнцаў. Напрыклад, Аліна Сабуць выступіла з дакладам “Літаратурная і фальклорная Воранаўшчына – сапраўдныя складнікі краязнаўства”. Шмат увагі надалі гісторыка-культурнай спадчыне, турыстычнаму патэнцыялу Воранаўшчыны. Дарэчы, раён у лідарах па колькасці беларускамоўных школ. Беларуская мова для дарослых і дзяцей тут з’яўляецца асноўнай. Адбылася тэатралізаваная прэзентацыя зборніка даследчых прац, выдадзенага па выніках “Воранаўскіх чытанняў-2023”.




Адбыліся цікавыя экскурсіі, змястоўныя прэзентацыі разнастайных праектаў, шчырыя сяброўскія гутаркі аднадумцаў. Праца форума працягнулася ў пяці тэматычных секцыях, якія размясціліся ў Воранаўскай сярэдняй школе. Старшакласнікі прадставілі на суд журы свае даследчыя працы, у якіх прадэманстравалі цікавасць да гісторыі і культуры роднага краю.



Воранаўская раённая бібліятэка стала лакацыяй дыялогавай пляцоўкі “Літаратура і краязнаўства – чыннікі нацыянальнага адзінства і патрыятызму”. Пасяджэнне правяла Алена Ганевіч.









З удзелам бібліятэкараў раёна розныя аспекты сучаснага літаратурнага працэсу і ролю ў ім краязнаўства абмеркавалі старшыня СПБ Алесь Карлюкевіч; гродзенскія літаратары Аліна Сабуць і Дзмітрый Радзівончык. У фармаце адкрытага дыялогу выступілі пісьменнікі з Воранаўшчыны Міхаіл Забалотны і Уладзімір Руль, госці з Ніжагародскай вобласці і іншыя. Адбыліся прэзентацыі калектыўных зборнікаў да 80-годдзя Вялікай Перамогі, а таксама іншых кніг, якімі папоўніўся фонд раённай бібліятэкі.

Форум завяршыў сваю работу ўзнагароджаннем юных талентаў у галіне краязнаўства. Іх даследаванні нароўні з працамі дарослых экспертаў будуць апублікаваныя ў выніковым зборніку. Такое яно – выхаванне сапраўдных грамадзян, патрыётаў праз творчасць, мастацтва, навуку… Хочацца адзначыць сардэчную цеплыню, гасціннасць, шчырую добразычлівасць гаспадароў, арганізатараў форуму. Гэтыя абаяльныя і працавітыя людзі, якіх шмат гадоў мы лічым сваімі сябрамі, фактычна ўжо сталі нам роднымі па духу. Як вынік “Воранаўскіх чытанняў-2025” – адзінства навукі, культуры і адукацыі, карысць ад якога ў чарговы раз пацвярджае само жыццё.

**САЮЗ ПІСЬМЕННІКАЎ БЕЛАРУСІ**
**ГРОДЗЕНСКАЕ АБЛАСНОЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**На фота:** Другі літаратурна-краязнаўчы форум "Воранаўскія чытанні": эпізоды і ўдзельнікі мерапрыемства. Воранава (Гродзенская вобласць). 5 лістапада 2025 года.


ВЫХОД
Вороновский район


Пішам
гадоў




ВЫХОД
Смачна


Смачна есці!




Сабуць
Аліна Эдмундаўна
Кандыдат філалагічных навук, дацэнт, дацэнт кафедры беларускай філалогіі УА «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы», лаўрэат Нацыянальнай літаратурнай прэміі
чная і фальклорная Воранаўшчына –
ўдныя складнікі краязнаўства




Воранаўскія чытанні
MCMXL






voran.by voran.by voran.by voran.by


Пішам


Пішам
85
ВОРАНАВА


Диалоговая площадка
ГУК «Вороновская районная библиотека»
"Літаратура і краязнаўства —
чыннікі нацыянальнага адзінства
і патрыятызму"
2025
voran.by voran.by voran.by voran.by


voran.by voran.by voran.by voran.by


ГЕНОЦИД
Без права на забвение
КНИГА СЛАВЫ
КИБЕРНЕТИКА ЖИЗНИ


voran.by
voran.by
voran.by
voran.by


ПРИРОДА БЕЛАРУСИ
voran.by
voran.by
voran.by
voran.by


voran.by
voran.by
voran.by
voran.by


voran.by
voran.by
voran.by
voran.by


voran.by
voran.by
voran.by
voran.by


ПОЛЕ ПАМЯТИ
Памяти
ВЕЧНЫЙ ОГОНЬ
voran.by
voran.by
voran.by
voran.by


voran.by
voran.by
voran.by
voran.by


ЗАКОН
ДОСТУ
КАЖДОМУ
voran.by
voran.by
voran.by
voran.by


ЗАКОН
ДОС
КАЖДОМУ
voran.by
voran.by
voran.by
voran.by


ОБЩАЯ
ТЕОРИЯ
ПРАВА
ПРЫТУЛАК
СЭРЦУ ДАРАГІ
voran.by voran.by voran.by voran.by


ЗАКОН
КАЖДОМУ
voran.by voran.by voran.by voran.by


ЗАКОН
ДОСТУПЕН
voran.by voran.by voran.by voran.by


ПЕСНЯРАМ АЙЧЫНЫ
voran.by voran.by voran.by voran.by


voran.by
voran.by
voran.by
voran.by


voran.by
voran.by
voran.by
voran.by


СДЕЛАНО В БЕЛАРУСИ
voran.by
voran.by
voran.by
voran.by


voran.by
voran.by
voran.by
voran.by


Аліна Сабуць
БЕЛАРУСКАЯ МАСТАЦКАЯ ПУБЛІЦЫСТЫКА
XX–XXI СТАГОДДЗЯЎ
voran.by voran.by voran.by voran.by


Памяти
ВЕЧНЫЙ ОГОНЬ
voran.by voran.by voran.by voran.by


КАЖДОМУ
voran.by
voran.by
voran.by
voran.by


voran.by
voran.by
voran.by
voran.by




*Выкарыстаны фота “Воранаўскай газеты” і сайта ГрДУ імя Янкі Купалы*

